ЗВЯЗДА

13 верасня 1996 г. серада, № 226 (23029)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1000 рублёў

❑ *«Шчодрасць» беларускіх мытнікаў абярнулася для дзяржавы стратай трыльёнаў рублёў.*

1-я стар.

❑ *Затрыманы «тэрарыст», які пагражаў узарваць Дом урада ў Мінску.*

1-я стар.

❑ *Сотні чалавек гінуць на беларускіх прадпрыемствах штогод з-за дрэнна арганізаваных умоў працы.*

2-я стар.

ВОЗГАЛАС

ЦЭНЫ

У Беларусі зрушылі з месца цэны на нафту і нафтапрадукты

З 10 верасня ў Беларусі ў сярэднім на 14 працэнтаў узняліся цэны на нафту і нафтапрадукты.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік упраўлення эканомікі і фінансаў канцэрна «Белнафтапрадукт» Анатоль Філінаў, гэтая мера была выклікана працэсамі індэксацыі цэн і зніжэннем абменнага курса беларускага рубля ў адносінах да долара ЗША.

Як вядома, апошні раз цэны на нафту і нафтапрадукты мяняліся ў краіне 1 лютага бягучага года (калі была ўстаноўлена цана адной тоны нафты ў памеры 80 долараў) і 17 красавіка (тады была праведзена індэксацыя на 5,2 працэнта). У выніку паступовага падзення курса беларускага рубля кошт адной тоны нафты ўсталёўвалася па стану на 10 верасня ў памеры 66,5 долара ЗША, у той час як свабодная яе цана ўжо дасягала 92—94 долараў. Праведзенае павышэнне «вярнула» нафце колішнюю цану ў валютным вымярэнні — 80 «зялёных» за адну тону. Зразумела, затое істотна змянілася цана ў беларускіх «зайчыках».

Як паведаміў Анатоль Васільевіч, на сённяшні дзень у выніку павышэння цэн на нафту на аўтазаправачных станцыях (АЗС) склаліся наступныя фіксаваныя (для інвалідаў, хуткай дапамогі, міліцыі) цэны: за літр аўтамабільнага бензіну маркі А-76 — 2900 рублёў, АІ-92 — 3100 рублёў, за адзін літр дызельнага паліва — 2200 рублёў. Зразумела, для астатніх пакупнікоў цэны на паліва на АЗС іншыя. Напрыклад, сталічная аўтазаправачная станцыя № 2 на вуліцы Брылеўскай прапаноўвае адзін літр бензіну маркі АІ-98 па цане 6700 рублёў, АІ-92 — 4500 рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Доўг Беларусі за энерганосьбіты зніжаецца марудна

Як стала вядома БелаПАН, па стану на 29 жніўня гэтага года доўг Беларусі за расійскі газ склаў 5 трлн. 510 млрд. 981 млн. беларускіх рублёў (на 4 ліпеня 1996 г. — 5 трлн. 246 млрд. 210 млн. руб.). За расійскі мазут Беларусь павінна 238 млрд. 310 млн. рублёў (на 4 ліпеня — 208 млрд. 198 млн. руб.).

Доўг Беларусі за электраэнергію Расіі складае 60 млрд. 849 млн. рублёў (на 4 ліпеня 1996 г. — 121 млрд. 438 млн.) і Літве — 24 млрд. 927 млн. рублёў (на 4 ліпеня — 23 млрд. 635 млн. руб.). Усесаюзнай знешнегандлёвай фірме «Энергія» запазычанасць Беларусі складае 275 млрд. 665 млн. рублёў (на 4 ліпеня 1996 г. — 264 млрд. 602 млн. руб.).

Яўген ГРУБІЧ, БелаПАН.

Ходзяць чуткі, што...

...у Мінску не хапае пасажырскага транспарту

Напэўна многія мінчане, ды і госці сталіцы заўважылі, што апошнімі днямі ў горадзе нібыта стала больш цесна, чым звычайна, у грамадскім транспарце. Нават у метро ў далёка не «пікавы» час людзей столькі, як у прыгараднай электрычцы падчас дачнага сезона. Ці не паменела ў Мінску маршрутаў грамадскага транспарту?

Як адказалі на гэтае пытанне ў Вытворчым упраўленні транспарту і сувязі Мінгарвыканкома, ніякага скарачэння колькасці маршрутаў пасажырскага транспарту апошнім часам у горадзе не было. Наогул, такія меры з той ці іншай нагоды прымаліся апошні раз яшчэ вясной. На сённяшні дзень у Мінску дзейнічаюць 128 аўтобусных пасажырскіх маршрутаў, 57 тралейбусных і 10 — трамвайных. Наплыў людзей у грамадскім транспарце апошнім часам, на думку спецыялістаў упраўлення, тлумачыцца, хутчэй за ўсё, масавым выхадам грамадзян з летніх водпускаў. Безумоўна, не абышлося тут і без «выбрыкаў» састарэлага парка машын, чые «капрызы» ў выглядзе шматлікіх паломак ужо добра вядомы гараджанам.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Да ведама дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Чарговае пленарнае пасяджэнне Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання адбудзецца 17 верасня 1996 года ў 16 гадзін у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у Доме ўрада.

Камень, які гаворыць: «Прабачце...»

Год назад, 12 верасня 1995 года, усю Беларусь узрушыла паведамленне аб трагедыі, якая здарылася каля горада Бяроза на Брэстчыне: збіты паветраны шар з двума грамадзянамі ЗША. Загінулі паветраплавальнікі Джон Сцюарт Джэрвіс і Алан Бернард Дрэнкел. Беларусь, якая толькі пачала набываць міжнародны аўтарытэт як незалежная дзяржава, апынулася ў непрыемным становішчы.

Падобна, што сумная «слава» свайго горада жыхарам Бярозы і дагэтуль вярэдзіць душу. У гадавіну здарэння на месцы, дзе загінулі людзі, некалькі гараджан пахавалі рэшткі карэзіны і шара, якія яшчэ там заставаліся. На насыпе замацавалі вялікі камень, дзе бронзай свецяцца крыжык, дата і надпіс: «Прабачце...» Ля гэтага помніка, што стаіць у ляску ля дачнага пасёлка паблізу вескі Круглае, ужо з'явіліся кветкі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

СПЕЦЫЯЛЬНА ДЛЯ «ЗВЯЗДЫ»

«Чорны кот», які пагражаў узарваць Дом урада, затрыманы

Як паведамляла «Звязда», 10 верасня каля сцен будынка Дома ўрада была знойдзена запіска з папярэджаннем пра быццам бы закладзеную ў Доме ўрада бомбу вялікай магутнасці. «Добразычлівец» падпісаўся псеўданімам «Чорны кот».

Праведзеныя мерапрыемствы па пошуку выбуховага ўстройства вынікаў не далі. І вось сенсацыйнае паведамленне: «Чорны кот» злоўлены. Затрыманы падчас спробы падкласці зноў на тое ж месца (правае крыло варот) чарговае паведамленне. Як ужо потым сказаў нашаму карэспандэнту начальнік Галоўнага ўпраўлення аховы пры Прэзідэнце РБ Міхаіл Цесавец, пад кіраўніцтвам якога вяліся пошукі бомбы, «бамбіста» чакалі і вельмі спадзяваліся, што ён зноў заявіць аб сабе. Так і атрымалася. Ім аказаўся жыхар горада Мінска, 1963 г. нараджэння, А. Львуцін. Пры сабе ён меў яшчэ адну запіску, а з дакументаў — пасведчанне інваліда I групы. Са слоў маці грамадзяніна Львуціна, яе сын стаіць на ўліку ў псіханеўралагічным дыспансеры і неаднаразова праходзіў лячэнне ў псіхіятрычнай бальніцы. Калі карэспандэнт нашай газеты прыехаў у Маскоўскі РАУС, яго ўвагу прыцягнула незвычайная для такой установы колькасць людзей у белых халатах. Як потым высветлілася, гэта былі ўрачы псіхіятрычнай клінікі, што а палове пятай гадзіны вечара і забралі грамадзяніна Львуціна ў псіхіятрычную бальніцу «Навінкі». Па словах супрацоўнікаў райаддзела, узяць якія б там ні было паказанні ў гатага чалавека немагчыма. Не ўдалося атрымаць з яго вуснаў і звязных тлумачэнняў тэксту другой запіскі.

Сяргей ПРОТАС.

КУРСЫ АБМЕНУ НАЯЎНЫХ ВАЛЮТ у камерцыйных банках на 12 верасня 1996 г.

Назва банка	Долар ЗША Купля	Долар ЗША Продаж	Нямецкая марка Купля	Нямецкая марка Продаж	Расійскі рубель Купля	Расійскі рубель Продаж	Тэлефоны
ФК «Вераніка» (за расійскія рублі)	18200 5420	18400 5500	12000	12400	3.30	3.40	53-15-04
Гал. упр. НБ па Мінску і Мінскай вобл. з улікам дылінг. прэміі	18000		11900		3.20		26-64-41
Ф-л 0104 АКБ «Мінскі транзітны банк» з улікам дыл. прэміі	17900	18400	11800	12200	3.20	3.35	372-825
Ф-л № 3 «Гарант» АСКБ «Тэхнабанк»*	15000 5410	18414 5500	12100	12372	3.30	3.42	331-917
АКБ «Аб'яднаны капітал»	18000	18500	11900	12300	3.15	3.30	394-092
СКБ «Тэхнабанк» з улікам дыл. прэміі	18100	18600	12150	12375	3.22	3.46	342-242
Нацыянальны банк РБ (курс для безнаяўных разлікаў)	14150		9678.71		2.71		
Цэнтрабанк Расіі	6361		3578.29		100 бел. р. 29.70		

Інфармацыя прадастаўлена агенцтвам Граўцова.

АДКРЫТЫ СПЕЦЫЯЛЬНЫ РАХУНАК

Па даручэнню Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі адкрыты спецыяльны рахунак у Міністэрстве фінансаў для падтрымкі правядзення 7 лістапада 1996 г. рэспубліканскага рэферэндуму па ўсенароднаму прыняццю новай рэдакцыі Канстытуцыі.

Як паведаміла Галоўнае ўпраўленне грамадска-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі Прэзідэнта, гэта рашэнне Аляксандра Лукашэнкі абумоўлена шматлікімі зваротамі грамадзян, прадпрыемстваў, арганізацый і камерцыйных структур з просьбай добраахвотнай грамадскай падтрымкі правядзення ўсенароднага рэферэндуму.

На спецыяльны рахунак «Рэферэндум-96» ужо выказалі жаданне пералічыць пэўныя сродкі акцыянернае таварыства «Мінскі маргарынавы завод», калгасы «Перамога» і «Крутагор'е» Крычаўскага і Дзяржынскага раёнаў, Рэспубліканскі грамадскі фонд садзейнічання рэформам, закрытае акцыянернае таварыства «Кантагруп» і іншыя.

Аляксандр Лукашэнка даў распараджэнне стварыць грамадскую камісію па кантролю і праверцы выкарыстання грамадскіх сродкаў. Работа камісіі будзе мець выключна адкрыты характар. Прэзідэнт запатрабаваў, каб прынцып сумленнай і шчырай добраахвотнай падтрымкі рэферэндуму захоўваўся ўсюды. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пералічваць сродкі могуць толькі тыя вытворчыя і працоўныя калектывы, якія працуюць з прыбыткам, без затрымак у выплаце зарплаты.

Аляксандр Лукашэнка зноў падкрэсліў, што ўсенародны рэферэндум 7 лістапада гэтага года пройдзе без затрат хоць бы аднаго рубля з дзяржаўнага бюджэту.

Нумар спецыяльнага рахунку «Рэферэндум-96» Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь у Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь 3780900000007, код банка № 042, код плацяжу № 09000. Тэлефон для даведак: (0172) 222-33-22

БЕЛТА.

КАМПАНІЯ «МАКДОНАЛЬДС» ВЕРЫЦЬ У НАШУ СВЕТЛУЮ БУДУЧЫНЮ І МАЕ НАМЕР «ПРАПІСАЦЦА» Ў БЕЛАРУСІ НАДОЎГА

Прэзідэнт рэспублікі Аляксандр Лукашэнка прыняў 12 верасня прэзідэнта кампаніі «Макдональдс» у Цэнтральнай Еўропе Андрэаса Хакера і прадстаўнікоў замежнага прадпрыемства «Рэстараны Макдональдса» ў Беларусі.

«Гэта, відаць, добры знак, калі вядучыя і вельмі багатыя фірмы прыходзяць і гатовы працаваць на нашым рынку», — сказаў, ацэньваючы ўклад кампаніі ў эканоміку краіны, кіраўнік дзяржавы. Сёння міжнародная карпарацыя «Макдональдс» мае амаль дваццаць тысяч рэстаранаў, размешчаных практычна на ўсіх кантынентах.

Наша рэспубліка — сотая краіна ў свеце, жыхары якой змогуць паспытаць фірменны гамбургер. І гэта не выпадкова. Як паведаміла карэспандэнту БЕЛТА дырэктар названага замежнага прадпрыемства пані Карэн Бішап, каб вызначыць уладальніка парадкавага нумара 100, праводзіўся спецыяльны тэндэр, у якім прымалі ўдзел Украіна, Балгарыя, Індыя. Але выйграла яго Беларусь як дзяржава, размешчаная ў самым цэнтры Еўропы.

Згодна з праектам, ужо ў пачатку снежня ў Мінску пачнуць работу адразу тры рэстараны. У перспектыве, разлічанай на пяць гадоў, прадугледжваецца будаўніцтва 60 аналагічных пунктаў хуткага харчавання. Наступная «высадка» «Макдональдса» намечана ў Брэсце і Гомелі. Па ўсёй рэспубліцы раскінецца сетка рэстаранаў, што дасць магчымасць стварыць новыя рабочыя месцы і выгадныя кантракты для многіх прадпрыемстваў сферы паслуг.

Разам з гэтым эканамічна выгадным для рэспублікі праектам — на сённяшні дзень кампанія ўклала ў яго каля 9 мільёнаў долараў — плануецца і шэраг дабрачынных акцый. У прыватнасці, адзначыла Карэн Бішап, прадугледжваецца выдзеліць некалькі мільёнаў долараў на лячэнне і аздараўленне хворых дзяцей. Акрамя таго, для вучняў мінскіх школ, размешчаных у раёне макдональдскіх пунктаў хуткага абслугоўвання, на працягу месяца будуць арганізаваны бясплатныя снеданні.

Тэрэза ХАЮЦІНА, БЕЛТА.

НА ПАРАЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯХ У АТЛАНЦЕ НАШЫ СПАРТСМЕНЫ ЯШЧЭ РАЗ ДАКАЗАЛІ, ШТО НЕАДОЛЬНЫХ БАР'ЕРАЎ НЕ БЫВАЕ

Непахісную сілу духу, мужнасць і мэтанакіраванасць прадэманстравала нацыянальная зборная каманда Беларусі на Паралімпійскіх гульнях у Атланце. Трынаццаць узнагарод прывезлі нашы спартсмены-інваліды з ЗША: тры залатыя, тры срэбраныя і сем бронзавых медалёў.

— Вы дастойна прадставілі Радзіму на сусветных гульнях у Атланце. За гэта вам вялікі дзякуй! Беларусь ганарыцца вашым спартыўным майстэрствам, і ведайце: дзяржава ў даўгу перад вамі, — сказаў 12 верасня на сустрэчы з удзельнікамі паралімпійскіх гульняў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. — Аднак цяпер становішча зменіцца. Я абяцаю вам, што спартсменам-інвалідам будуць створаны максімальныя ўмовы для таго, каб яны ні ў чым не адчувалі сябе ўшчэмленымі і каб на чарговых гульнях у Сіднэі наша каманда была ўдвая больш прадстаўнічай.

Але не ўсё бязвоблачна ў жыцці спартсменаў-інвалідаў. Часта ім не хапае простага чалавечага разумення і спагады, не кажучы ўжо аб жыццёвых цяжкасцях. Прэзідэнт уважліва выслухаў іх просьбы і пажаданні. Ён абяцаў сваё садзейнічанне ў вырашэнні бытавых і жыллёвых праблем паралімпійцаў, разам з імі парадаваўся стварэнню ў рэспубліцы асобай арганізацыі — Паралімпійскага камітэта. Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што сваімі спартыўнымі перамогамі і асабістай мужнасцю яны будуць садзейнічаць умацаванню маральнага духу маладых людзей, якія па волі лёсу апынуліся ў цяжкіх жыццёвых умовах, і заклічуць іх на спартыўныя пляцоўкі, каб весці незалежны, нармальны спосаб жыцця.

Завяршаючы сустрэчу, Аляксандр Лукашэнка ад усяго сэрца пажадаў паралімпійцам здароўя і новых спартыўных дасягненняў.

Валянціна МЕНШЫКАВА, БЕЛТА.

Адным сказам

● Колькасць мужчын і жанчын, якім у верасні-кастрычніку прадастаўлены **бясплатны праезд** на прыгарадным чыгуначным транспарце, складае **каля 2,5 мільёна чалавек.**

● Нядаўна праведзеныя **даследаванні сведчаць** аб тым, што спажыванне вады з залішнім утрыманнем хлору ў 1,5—2 разы павялічваюць **рызыку захворвання ракам.**

● У тавараабароце Беларусі ўстойліва **расце ўдзельная вага неарганізаванага рынку**: так, у 1995 годзе яна склала 17,2 працэнта, а за сем месяцаў бягучага — 21,6 працэнта.

● **Стратнасць** чыгуначных мясцовых пасажырскіх перавозак за сем месяцаў бягучага года склала **131,5 мільярда рублёў**, прыгарадных — **397 мільярдаў.**

● За сем месяцаў бягучага года **ў спісе даўжнікоў** па зарплаце **адсутнічаюць** такія інстытуты, як банкі, апараты органаў дзяржаўнага і гаспадарчага кіравання, судовыя і юрыдычныя ўстановы.

● Да канца гэтага года ў сталіцы рэспублікі павінна быць **прыватызавана 80 працэнтаў** аб'ектаў камунальнай уласнасці.

● Аўстралійскія вучоныя зрабілі **адкрыццё**, якое можа зрабіць рэвалюцыю **ў лячэнні рака і СНІДу:** знойдзены вучонымі фермент знішчае ў арганізме хворага адміраючыя клеткі, што дазволіць адмовіцца ад такіх метадаў, як радыяцыйнае апраменьванне і хіміятэрапія.

● Стыхійнае бедства, ад якога ў пачатку жніўня пацярпеў Лельчыцкі раён, нанесла **ўрон**, памер якога **ацэньваецца ў 178 мільярдаў рублёў.**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Мытня дае «дабро» і... перагінае палку?

Шчодрасць мытнікаў часам абарочваецца трыльённымі сумамі неспагнаных плацяжоў у бюджэт

У папярэднім нумары «Звязды» мы пачалі гаворку аб выніках праверкі Кантрольнай палатай Беларусі мытных органаў, аб якіх ішла размова на пасяджэнні Савета Кантрольнай палаты ў сераду. Пры ўсёй павазе да нялёгкай працы нашых мытнікаў, якіх на кожным кроку спрабуюць падмануць (каму ж даспадобы ў поўнай меры плаціць пошліны?), на жаль, трэба канстатаваць, што яны даволі часта трапляюць на «вуду» зацікаўленых у гэтым суб'ектаў. Ці то прафесіяналізму ім не хапае, ці то абыякавасць падводзіць. Іншыя тлумачэнні гэтаму шукаць неяк і не хочацца.

Як бы там ні было, але менавіта дзякуючы хібам, якія часам дапускаюць мытнікі, бюджэт рэспублікі не папаўняецца даволі значнымі сумамі даходаў. І хоць фактаў, якія сведчаць аб гэтым, на савеце Кантрольнай палаты прыводзілася шмат, мы аддадзім перавагу найбольш яскравым.

У мінулым годзе, напрыклад, калгас «Маяк» Магілёўскага раёна «надуў» бюджэт на 158.038.750 рублёў мытнай пошліны. Што для гэтага спатрэбілася, дык гэта толькі выкарыстаць бескантрольнасць з боку Магілёўскай мытні. У 1995 годзе калгас завёз з Польшчы, Ірландыі і Нарвегіі 154,7 тоны свежамарожанай скумбрыі і селядцоў агульным коштам 1095,1 мільёна рублёў і ў грузавых мытных дэкларацыях заявіў рэжым актыўнага ўдасканалвання. І парушыў яго, рэалізаваўшы 147,5 тоны рыбы на тэрыторыі рэспублікі, не заплаціўшы пры гэтым мытнай пошліны.

Дарэчы, з не меншым поспехам дзейнічалі і некаторыя замежныя інвестары, якія выкарыстоўвалі Закон «Аб замежных інвестыцыях на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» у сваіх мэтах. Згодна з ім, маёмасць, сыравіна і матэрыялы, якія ўвозяцца замежным удзельнікам для фарміравання статутнага фонду прадпрыемства з замежнымі інвестыцыямі, вызваляюцца ад уплаты мытнай пошліны. Для выкарыстання розуму знайшлося поле дзейнасці: з'явіліся інвестары, якія заяўлялі вялізныя сумы статутных фондаў ствараемых імі прадпрыемстваў, увозілі хадавыя тавары пад выглядам папаўнення статутнага фонду, але рэалізоўвалі іх у парушэнне заяўленага мытнага рэжыму без унясення ў бюджэт значных сум мытнай пошліны і іншых падаткаў. Заўважым: на гэтым некаторыя з іх інвестыцыйную дзейнасць у рэспубліцы і заканчвалі.

Толькі некалькі прыкладаў. Замежнае прадпрыемства «Ард-Плюс». У якасці ўкладу ў статутны фонд нямецкі інвестар заявіў легкавыя аўтамабілі, былыя ў карыстанні, на агульную суму 240 тысяч долараў. Нягледзячы на тое, што мытны кошт першай партыі ўвезеных аўтамабіляў быў яўна заніжаны, сума льгот па мытнай пошліне склала амаль 118 мільёнаў рублёў. Грошыкі, як кажуць, «плакалі».

А вось замежнае прадпрыемства «Дакота Файнэншл» наогул знікла пасля ўдала праведзенай аперацыі. У мінулым годзе прадпрыемства ўвезла з Польшчы і Чэхіі, зноў-такі быццам бы для фарміравання статутнага фонду, офісная мэблі агульным коштам каля 120 тысяч долараў і спыніла сваю легальную фінансава-гаспадарчую дзейнасць. Дзе яно знаходзіцца зараз — невядома.

Мільярды рублёў дзяржава страціла на гарэлцы: суб'екты гаспадарання куплялі за СКВ гарэлку і іншыя спіртныя напоі ў вытворцаў, афармлялі мытныя дэкларацыі ў рэжыме экспартнай пастаўкі (што вызваляла іх ад уплаты акцызаў), але ў парушэнне гэтага не вывозілі іх за межы тэрыторыі мытнага саюза, ухіляючыся тым самым ад унясення ў бюджэт краіны значных сум акцызаў. Забягаючы наперад скажу, што ні адна юрыдычная ці фізічная асоба так і не была па стану на 1 чэрвеня прыцягнута мытнымі органамі да адказнасці.

Каб адчуць усю грандыёзнасць «гарэлачнага махлярства», звернемся да вынікаў праверкі таго ж Полацкага вінзавода. Ім у верасні—снежні 1995 года было адгружана на Украіну і Малдову больш чым 129 тысяч бутэлек «Рускай» гарэлкі на звыш 80 тысяч USD, правоз якіх праз прыгранічныя мытныя пункты не пацверджаны. З атрыманых Полацкай мытняй адказаў ад калег з Украіны і Малдовы ўстаноўлена, што многія фірмы, у адрас якіх адпраўляліся вінна-гарэлачныя вырабы Полацкага вінзавода, не існуюць ці дагавораў на набыццё гуралкі не заключалі.

Такое ж становішча выяўлена і ў Гродзенскай вобласці, дзе непацверджаны вываз за межы рэспублікі звыш 1,5 млн. літраў алкагольных вырабаў і каля 99 мільёнаў штук цыгарэт агульным коштам звыш 2,3 млн. долараў. Прынамсі, сума недаўнесеных у бюджэт акцызаў толькі па гарэлцы склала каля 27 мільярдаў рублёў.

І, бадай, самы буйны пралік, які ўдалося «раскалаць» кантралёрам палаты, датычыцца адтэрміноўкі па мытных плацяжах, прадастаўленай дзяржаўнаму гандлёва-экспазіцыйнаму прадпрыемству «Гандальэкспа», умовы якой парушалі патрабаванні ўказа Прэзідэнта Беларусі.

Не паглыбляючыся ў дробязі, адзначым толькі, што на 7 мая гэтага года сума неспагнаных мытных плацяжоў па грузах, увезеных «Гандальэкспа» на тэрыторыю Беларусі за час прадастаўленай адтэрміноўкі і аформленых толькі на Полацкай мытні, склала 3051,06 млрд. рублёў, што дасягае агульнай сумы ўсіх мытных даходаў, атрыманых мытнымі органамі на працягу 1995 года і пералічаных у дзяржаўны бюджэт. Што і казаць, шчодрасць па нашым часе проста незвычайная. Праўда, уласныя кішэні шчодрых мытнікаў у дадзеным выпадку не пацярпелі. А вось «кішэня» краіны, магчымасці якой, на жаль, як мы ўжо пераканаліся, не бязмежныя, пацярпела. Аднак, відаць, хтосьці гэтага не ўсведамляе. Мала прыемнага і ў тым, што звычка пастаянна вучыцца на сваіх памылках глыбока ўкаранеяцца ў галовы беларусаў.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Падыходы да вырашэння чарнобыльскіх праблем будуць зменены

«Чарнобыльскае пытанне — напалову палітычная праблема», — заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў час свайго рабочага візіту на Беларускі цэментны завод. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, падыходы да ліквідацыі вынікаў катастрофы ў бліжэйшы час будуць зменены.

Тэрыторыя Касцюковіцкага раёна моцна забруджана. На палі, прыгодныя для земляробства, сельскагаспадарчая тэхніка штодзённа выязджае за дзесяткі кіламетраў. Транспартныя расходы «з'ядаюць» увесь прыбытак, які вяскоўцы атрымліваюць ад рэалізацыі гатовай прадукцыі. Прэзідэнт рэкамендаваў мясцовым уладам засяліць усе чыстыя землі, стварыць малыя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, своеасаблівыя філіялы калгасаў. У рэжыме жорсткай эканоміі павінны весціся і будаўнічыя работы. За кошт рэспубліканскага бюджэту будуць узводзіцца невялікія машынна-трактарныя двары і жывёлагадоўчыя фермы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што працэс вяртання людзей у чарнобыльскую зону на абжытыя месцы пачаўся ўжо стыхійна. Задача дзяржавы — праявіць клопаты аб здароўі і быце перасяленцаў.

Уладзіслаў ПЛАТУН, БЕЛТА.

Сямён Шарэцкі выступае за хутчэйшае ўступленне Беларусі ў Савет Еўропы

Старшыня Вярхоўнага Савета рэспублікі Сямён Шарэцкі вечарам 11 верасня правёў сустрэчу з дэлегацыяй Еўрапейскага дэмакратычнага саюза — аб'яднання еўрапейскіх палітычных партый кансерватыўна-ліберальнай арыентацыі.

Паводле слоў Сямёна Шарэцкага, нягледзячы на складанасці, беларускія парламентарыі зробяць усё магчымае, каб рэспубліка была прынята ў Савет Еўропы. Разам з тым ён папрасіў прадстаўнікоў Еўрапейскага дэмакратычнага саюза пасадзейнічаць працэсу хутчэйшага ўступлення Беларусі ў гэту аўтарытэтную міжнародную арганізацыю. Калі б рэспубліка была членам Савета Еўропы, падкрэсліў спікер, гэты статус абавязваў бы яе прытрымлівацца прынцыпаў і законаў, якія там склаліся.

Ларыса КЛЮЧНІКАВА, БЕЛТА.

Кіраўнікі спецслужбаў краін СНД сустрэліся ў Віскулях

12 верасня ў Віскулях пачала работу IV Нарада кіраўнікоў органаў бяспекі і спецслужбаў краін СНД.

У гісторыю яна ўвойдзе як Мінская, па аналогіі з Маскоўскай, Тбіліскай і Душанбінскай. Неабходнасць інтэграцыі спецслужбаў выклікана аб'яднаннем намаганняў у барацьбе з арганізаванай злачыннасцю, тэрарызмам, наркабізнесам, кантрабандай ядзерных кампанентаў. Кожная з папярэдніх сустрэч унесла свой уклад у абмеркаванне пытання аб каардынацыі сумесных дзеянняў, павышэнні іх эфектыўнасці і аператыўнага прыняцця рашэнняў. У гэтых мэтах трэба будзе стварыць Савет кіраўнікоў органаў бяспекі і спецслужбаў. Парадак дня прадугледжвае абмеркаванне вынікаў работы па далейшаму разгортванню абаненцкіх звёнаў Аб'яднанага банка даных, неабходнасць якога каментарыяў не патрабуе.

У сваім прывітанні членам дэлегацый старшыня КДБ Беларусі Уладзімір Мацкевіч адзначыў: «Нам прыемны факт правядзення гэтай нарады ў нашай рэспубліцы, паколькі ўсямернае развіццё СНД знаходзіцца ў сферы прыярытэтных інтарэсаў Беларусі. Мы, прадстаўнікі органаў бяспекі і спецыяльных службаў, павінны аб'яднаць свае намаганні для таго, каб паспрабаваць стварыць такія ўмовы для развіцця нашых краін, у якіх не знайшлі б месца ні разгул злачыннасці, ні міжнацыянальныя спрэчкі».

У гэтым і заключаецца галоўнае прызначэнне спецслужбаў, а рэчаіснасць сённяшняга дня настойліва патрабуе сумесных намаганняў для забеспячэння спрыяльных умоў эканамічнага і палітычнага інтэгравання краін Садружнасці.

Падпісанне дасягнутых пагадненняў намечана на 13 верасня.

БЕЛТА.

Абрамовіч заклікае Ганчара да нейтралітэту

З нагоды абрання Віктара Ганчара на пасаду старшыні Цэнтрвыбаркома карэспандэнт «Звязды» папрасіў выказацца яго папярэдніка, а цяпер намесніка кіраўніка прэзідэнцкай Адміністрацыі Аляксандра АБРАМОВІЧА.

— Аляксандр Міхайлавіч, як вы ацэньваеце факт назначэння Віктара Ганчара, якімі вы бачыце перспектывы ягонай працы?

— Нармальна ацэньваю. Назначэнне на гэтую пасаду адносіцца да кампетэнцыі Вярхоўнага Савета. Я толькі магу, з аднаго боку — павіншаваць Віктара Іосіфавіча, з другога — паспачуваць, бо работа старшыні Цэнтрвыбаркома вельмі няпростая, яна патрабуе не толькі кваліфікацыі, але і ўмення шукаць пункты сутыкнення з тымі структурамі, якія могуць найбольш поўна і эфектыўна забяспечваць выкананне дзеючага заканадаўства. Сам, адзін, нічога не зробіш, трэба ўзаемадзейнічаць з выканаўчымі органамі, мясцовымі Саветамі. Таму, хто назначаецца на такую пасаду і мае намер працаваць з поўнай аддачай, проста не пазайздросціш...

— Аляксандр Міхайлавіч, а з пункту гледжання прадстаўніка выканаўчай улады вы даваеце Ганчару як спецыялісту?

— Такіх фактаў, якія падштурхоўвалі б да гэтага, не было. Але зразумела, што Віктар Іосіфавіч быў дэпутатам, а дэпутат — з'ява палітычная, ён выказвае дакладны палітычны інтарэс. Гэты інтарэс час ад часу ўступаў у супярэчнасць з інтарэсамі іншых палітычных сіл, што натуральна і нармальна. Тут усё залежыць ад таго, як далей будуць развівацца падзеі і якім чынам будзе праведзена ім пэўная палітычная лінія. Тут ужо патрэбна не лінія палітычнага інтарэсу, а лінія нейтралітэту.

— Такім чынам, вы заклікаеце В. Ганчара да нейтралітэту?

— Так. Як мінімум.

— Вы з ім ужо размаўлялі пасля яго назначэння? Аб чым?

— Мы ўдакладнялі пэўныя пытанні. Мы ведаем, што адначасова назначаны выбары і рэферэндум. Тут ёсць істотная розніца ў тым, што камісіі па рэферэндуму ўтвараюць Саветы, а па выбарах — утвораны раней выканкомамі. Мы высвятлялі, як можна гэта спалучыць, і тут нашы погляды супалі, што трэба ініцыраваць у Вярхоўным Савеце пытанне аб тым, каб сумясціць гэтыя камісіі, бо не могуць жа на ўчастку сядзець па дзве камісіі.

Інтэрв'ю правёў Валер КАЛІНОЎСКІ.

Беларускія палітыкі пра зварот С. Шарэцкага

На гэтым тыдні газета «Народная воля» апублікавала Зварот да народа Беларусі Старшыні Вярхоўнага Савета Сямёна Шарэцкага пад загалоўкам: «Людзі, будзьце пільнымі! У рэспубліцы запахла фашызмам!» У гэтай публікацыі Сямён Шарэцкі прама заяўляе аб схільнасці Аляксандра Лукашэнкі да дыктатуры, і зазначае, што прапанаваны Прэзідэнтам праект Канстытуцыі з'яўляецца прававой асновай для такога вось дзяржаўнага ўладкавання. Публікацыя насычана многімі непрыемнымі для Аляксандра Лукашэнкі і яго акружэння ацэнкамі, фактамі, разважаннямі. Карэспандэнт «Звязды» папрасіў пракаментаваць гэтую публікацыю некалькіх вядомых палітыкаў як з боку Вярхоўнага Савета, так і з боку прэзідэнцкай адміністрацыі.

Першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Васіль НОВІКАЎ:

— Я нармальна ацэньваю гэты артыкул, мы працуем з Сямёнам Георгіевічам разам і я падтрымліваю яго. Гэта яго асабісты зварот як кіраўніка заканадаўчай галіны ўлады.

— Ці не лічыце вы, што абвінавачанні ў фашызме ўсё ж празмерныя?

— Я не думаю, што гэта нейкае перабольшанне дзеля эфекту. Гэта асабістая справа аўтара, як падаваць матэрыял, якім быць эмацыянальнаму зараду і г. д. У мяне крыху іншы стыль, у яго вось такі. Я не мяркую, што з гэтай нагоды трэба крычаць аб канцы свету, як спрабуюць падаць. Проста чалавек занепакоены.

— Як вы думаеце, чаму Сямён Георгіевіч звярнуўся ў «Народную волю», а не ў якую-небудзь іншую газету?

— Уся справа ў тым, што ў афіцыйныя СМІ звяртацца бескарысна. Я напісаў ужо чацвёртую просьбу на імя кіраўніка Белдзяржтэлерадыёкампаніі аб прадастаўленні тэлеэфіру для двух намеснікаў Старшыні Вярхоўнага Савета і члена Прэзідыума. Калі ў панядзелак я прасіў эфір, адмовілі, а вечарам на БТ Дудзінаў «практыкаваўся» на тэму С. Шарэцкага, у аўторак экранам уладарыў Прэзідэнт, у сераду выступаў М. Карпіевіч, які нічога не заказваў... А я ўсё звяртаюся да Г. Кісяля, але гэта сходзіць як у пясок, ніякай рэакцыі. А што датычыць дзяржаўных газет, то пазаўчора я падпісаў праект Канстытуцыі ад фракцый камуністаў і аграрыяў і выступленне С. Калякіна з яго абгрунтаваннем, але пакуль яго не друкуюць. Таму натуральна, што звяртанне ў дзяржаўныя СМІ стала бескарысным — дзейнічае інфармацыйная блакада вакол Вярхоўнага Савета.

— Скажыце, а якая рэакцыя вакол гэтага артыкула ў парламенцкіх колах?

— Наколькі я размаўляў з дэпутатамі, яны яго чыталі і адабраюць, няма ніякага нагнятання страсцей. Я не схільны тут да драматызацыі, адбываецца тое, чаго дабіваліся доўгія гады: дэмакратыя і плюралізм.

— Ці сведчыць гэта, што пачалася адкрытая канфрантацыя паміж парламентам і Прэзідэнтам?

— Не, я лічу, што ідзе нармальны працэс, працуе Вярхоўны Савет, Прэзідэнт выступіў ініцыятарам рэферэндуму, ніхто з дэпутатаў не запярэчыў яму ў гэтым. Акрамя таго, рэферэндум ініцыраваў і другі суб'ект, які мае на гэта права, — 84 дэпутаты. Тут няма ніякай трагедыі, ніякага перавароту, ніякай канфрантацыі...

**Сяргей П

РОЗГАЛАС

«ДЖЫПЫ» АД КАМПАНІІ «ФІЛІП МОРЫС»

Чарговую акцыю пачало праводзіць у Беларусі прадстаўніцтва кампаніі «Філіп Морыс». А ў якасці суперпрызоў выбраны два «джыпы». Акрамя гэтага, як было паведамлена на прэс-канферэнцыі, пераможцамі стануць яшчэ дзве тысячы чалавек, якія будуць узнагароджаны світэрамі, спартыўнымі сумкамі і бейсбольнымі кепкамі.

У кожнага ёсць шанц выйграць іх. Для гэтага неабходна толькі ўзяць у распаўсюджвальнікаў латарэй спецыяльны канверт, укласці ў яго два вечкі ад цыгарэт «Мальбара», указаўшы дакладныя даныя аб сабе, і не пазней за 26 кастрычніка адправіць па пошце або прынесці ў адзін з цэнтраў па іх прыёму. Яны размясціліся не толькі ў нашай сталіцы, але і ва ўсіх абласных гарадах. Імёны пераможцаў стануць вядомыя ў час розыгрышу 9 лістапада.

Гэта акцыя праводзіцца для паўналетніх курцоў рэспублікі. І, як было падкрэслена на прэс-канферэнцыі, не з мэтай распродажы цыгарэт вядомай кампаніі, імідж якой даволі высокі, а ў знак удзячнасці беларускім спажыўцам, якія выбралі іменна гэту марку.

Міхаіл ЖУРАВОВІЧ, БЕЛТА.

БЕЛАРУСЬ НЕ САХАРА

Гэта так. Але сонечнай энергіі хапае і ў нас. Так лічаць вучоныя і раяць выкарыстоўваць яе.

Але як? Высветліць такое пытанне збіраюцца даследчыкі і практыкі на семінары, які адбудзецца ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры 17 верасня. Тут будуць прадстаўлены праекты выкарыстання сонечнай энергіі, а таксама вопыт Аўстрыі, Украіны, іншых краін у гэтай справе.

Алесь КРАЎЧУК.

СВЯТА ЛЕСАВОДАЎ

Хутка работнікі лесу і лесаапрацоўчай прамысловасці адсвяткуюць сваё прафесіянальнае свята — ужо ў трыццаты раз.

Клопатам і праблемам лесаводаў была прысвечана сустрэча з генеральным дырэктарам Міністэрства вытворчых лесагаспадарчых аб'яднанняў Міхаілам Хадасевічам. Якія ж праблемы хвалююць зараз лесаводаў? Гэта і радыяцыя: 87,2 тыс. га лясоў зараз радыеактыўныя; гэта і праблема збыту, перапрацоўкі лесу (як адзначыў Міхаіл Хадасевіч, перапрацоўчых заводаў не хапала ніколі, не хапае і зараз). З болем гаварылі госці пра лясныя пажары, калі за гадзіну агонь знішчае ўсё, што расло гадамі. Сярод іншых праблем было названа і захламленне лясоў — натуральнае, нават, можна сказаць, карыснае, і бытавое, якое, па сутнасці, асаблівай шкоды лесу не прыносіць, але ж у эстэтычных адносінах...

Давайце берагчы лес... Гучыць банальна, але няхай усё ж дзякуючы нам прасцей будзе працаваць лесаводам. Няхай гэтае свята яны адзначаць як мае быць — з добрым настроем і віншаваннямі, у тым ліку і ад «Звязды».

Яна САВІЦКАЯ.

НАВУКОЎЦАМ, ВЫПУСКНІКАМ ВНУ І СТУДЭНТАМ, ЯКІЯ ВАЛОДАЮЦЬ НЯМЕЦКАЙ МОВАЙ

Ёсць шанц атрымаць стыпендыі для стажыроўкі ва універсітэтах Германіі ў 1997/1998 навучальным годзе.

Каб атрымаць стыпендыю, трэба прайсці конкурс, у якім могуць удзельнічаць асобы да 32 гадоў. Стыпендыі разлічаны на розныя тэрміны: ад аднаго да дзесяці месяцаў.

Акрамя гэтага прапаноўваюцца 3-4-тыднёвыя летнія курсы для студэнтаў-германістаў і маладых выкладчыкаў германістыкі і гуманітарных дысцыплін (за выключэннем настаўнікаў нямецкай мовы сярэдніх школ).

Конкурс арганізаваны Міністэрствам адукацыі і навукі Беларусі і нямецкім пасольствам у Мінску. Таму за тлумачэннямі і даведкамі трэба звяртацца туды. Тэлефоны: у міністэрстве — 220-71-21, у пасольстве — 233-07-52.

Леанід ТУГАРЫН.

ГЛЫБІНКА

Проста шкляны слоік

Ёсць побач з гарадскім пасёлкам Варапаева, што на Віцебшчыне, вёска Гута, ну а ў вёсцы, зразумела па яе назве, шклозавод, таксама «Гута». Пятніца, другая палова дня, пад'язджаем да завода і проста дзіву даёмся. Ён з усіх бакоў акружаны магутнымі «КамАЗамі» з вялікімі прычэпамі. Нумары розных абласцей Беларусі. Потым ужо даведваемся, што тут «ганцы» з Гарыні і Кобрына, Турава і Слуцка, з Гродна.

Справа ў тым, што ў калгасах і саўгасах Беларусі ідзе ўборка зяленага гарошку. І кансервавым заводам у гэтых гарадах як паветра патрэбен шкляны слоік.

Патрэбен як паветра, бо справа прыгатавання гарошку вельмі тонкая, тут сыравіну не тое што нельга ператрымаць, яе нельга доўга везці да завода. Толькі ўбраў — і адразу па слоіках. А слоікаў на заводах няма. А гарох у полі перастойвае і хутка будзе непрыгодны для прыгатавання прадукцыі. Вось і акружылі шклозавод аўтамашыны-ганцы: «Дайце слоікі!»

Завод працуе на поўную магутнасць, а гэта сто тысяч слоікаў за суткі. Слоікі грузяцца ў аўтамашыны яшчэ гарачымі. Але іх усё роўна не хапае. Ужо цяпер зразумела, што гарох на палях застанецца, будзем абыходзіцца мы не сваёй прадукцыяй, а малдаўскай, нейкай іншай.

Шклозавод «Гута» па выпуску літровых, паўлітровых слоікаў на Беларусі манапаліст, выпускае яшчэ слоікі (праўда, па 0,25 л) толькі завод «Кастрычнік» на Магілёўшчыне.

Але ж «Гута» практычна банкрут. Яна доўгі час увогуле стаяла, накопліваючы даўгі і пені. Вясной на сваю рызыку запусціліся. І дзякуючы Малдове, якая нават дала аванс, запрацавалі. З ёю, і асабліва з Расіяй, і звязваюць завадчане свае надзеі на выжыванне. Туды пойдзе асноўная прадукцыя, туды будуць збываць і слоік 0,25 л, на выпуск якога мяркуецца перавесці адну лінію.

Мяркуюць выпускаць і двухлітровы слоік, вельмі патрэбны насельніцтву, і слоік пад так званую накрыўку «твіст».

Ёсць планы па рэканструкцыі, ёсць дамоўленасці з патэнцыяльнымі пакупнікамі слоікаў. Але ціснуць даўгі, якія ўтварыліся за час прастою. З бюджэтам дзякуючы працы ў гэтым месяцы разлічыліся. Ды застаюцца два мільярды на картатэцы. І цяпер практычна праз банк працаваць нельга. Толькі паступяць на рахунак грошы — яны адразу ідуць у лік пагашэння запазычанасці. Як жа працаваць, як закупіць тую ж соду толькі ў Расіі і толькі за расійскія рублі?

А вытворчасць не старая, адладжаная і магла б даваць у бюджэт мільярды.

— Ну а як з беларусамі? — пытаюся ў дырэктара завода Паўла Фіськовіча.

— А з беларусамі працаваць цяжкавата. Бачыце, колькі машын стаіць за літровым слоікам? А зусім нядаўна на нарадзе ў Мінску прадстаўнікі харчпрама вызначылі патрэбнасць нашых кансервавых заводаў у 2,5 мільёна паўлітровых слоікаў. «А літровых?» Маўчанне.

Алесь КАСЦЕНЬ.

ПОГЛЯД

А карміцеляў усё менш...

Цяпер шмат пішацца і гаворыцца пра тое, колькі зарабляюць ці атрымліваюць прадстаўнікі той ці іншай прафесіі, той ці іншай сацыяльнай групы. Зайздросцяць банкірам, шкадуюць беспрацоўных. Сапраўды, імкліва ідзе падзел на адносна багатых і вельмі бедных. Ну, а на самых полюсах з'явіліся нядаўна невядомыя грамадству сапраўдныя мільянеры, якія не хаваюць сваіх доларавых мільёнаў, і сапраўдныя жабракі, якія ўжо не могуць схаваць свайго жабрацкага стану.

Але неяк мяне зацікавіла іншае: колькі ў нас карміцеляў і тых, хто ў той ці іншай форме спажывае іх здабыткі. Вырашыў прагледзець гэта на прыкладзе раёна, дзе жыву. У буйнейшых маштабах, зразумела, будуць нейкія змяненні, але не такія і вялікія.

Пастаўскі раён налічвае 53 тысячы жыхароў, што для Віцебшчыны даволі высокі ўзровень: як вядома, яна яшчэ не дасягнула даваеннай колькасці насельніцтва.

Дык вось, аб карміцелях. Найперш гэта, безумоўна, вяскоўцы. У калгасах і саўгасах працуюць менш як сем тысяч чалавек. Фермеры, якіх дзесяткі чатыры, практычнай ролі ў «карміцельстве» не маюць, ды па-сапраўднаму даюць прадукцыю толькі некалькі з іх. У прамысловасці раёна працуюць дзве з паловай тысячы чалавек. На будаўніцтве, транспарце, у сувязі, збыце ды забеспячэнні, іншых арганізацыях, якія прадукцыі не даюць, але функцыянаванне эканомікі забяспечваюць, а самае галоўнае, даюць дзяржаве падаткі — яшчэ каля дзвюх тысяч.

Вось і ўсё. Астатнія толькі бяруць з бюджэту ці іншых фондаў, напрамую звязаных з бюджэтам.

Тры тысячы чалавек працуюць на ніве адукацыі, аховы здароўя, культуры. Найбольш настаўнікаў, найменш — культработнікаў. Калі лічыць і міліцыю, у раёне больш за шэсцьсот дзяржаўных служачых.

Адметнасцю Пастаўскага раёна з'яўляецца адносна вялікае, у параўнанні з суседнімі, беспрацоўе. Гэта тлумачыцца ліквідацыяй вайсковых часцей, скарачэннямі на буйным заводзе «Беліт». 1500 чалавек стаяць на ўліку ў службе занятасці.

Але найбольш пенсіянераў. Іх 16,000. (Не ўлічваючы 600 ваенных пенсіянераў, якія атрымліваюць грошы з іншай крыніцы.)

Адсюль вялікі дэфіцыт раённага бюджэту, пастаянныя праблемы з выплатай заработнай платы настаўнікам, урачам. Менавіта на Пастаўшчыне практыкуецца перавод культработнікаў на летні час на палову стаўкі.

Ды бачыцца за ўсімі гэтымі лічбамі і іншае. Калі не ўлічваць некалькі адносна моцных — усе гаспадаркі раёна, вобразна кажучы, ляжаць на баку, вытворчасць тут ідзе як бы па інерцыі, не даючы эканамічнага выніку. Амаль такая ж сітуацыя і ў прамысловасці, будаўніцтве. Няпэўнасць — так, напэўна, можна вызначыць становішча ў цэлым. За нейкімі выключэннямі. І гэта не можа спрыяць сацыяльнай актыўнасці. Кожны з «карміцеляў» паасобку імкнецца да звычайнага выжывання, дзе бадай што галоўнай мэтай становіцца — утрымацца пры чарговым скарачэнні. Тым больш назіраецца гэта ў сферах, якія існуюць за кошт бюджэтных «уліванняў». Тут цэлыя калектывы могуць апынуцца ў становішчы або «любімца», альбо «пасынка». Бо сродкаў на ўсіх хранічна не хапае.

І не ад непрадказальных вынікаў выбараў, паражэнняў на іх дэмакратычнага крыла, а менавіта адсюль, на мой погляд, вынікае той феномен, што ў апошні час палітычнае жыццё ў правінцыі практычна заглухла, філіі і аддзяленні партый і рухаў, якія досыць гучна заяўлялі аб сабе яшчэ некалькі гадоў назад, альбо існуюць у санлівым стане, альбо зусім спынілі сваё існаванне. Палітычнае жыццё перамясцілася ў сталіцу.

Алесь КАСЦЕНЬ.

МАРАЛЬ І ПРАВА

СПЯРША ЗАПЛАЦІ ПОШЛІНУ

У свой час грамадзянка Вольга Уладзіміраўна Аўдзейчык была прапісана ў кватэры № 25 дома № 5, што па вуліцы Мірашнічэнкі беларускай сталіцы. Потым яе сыну, у сям'і якога яна пражывала, прадаставілі лепшую кватэру, аднак маці ў ордэр не ўключылі. Па логіцы, яна павінна была застацца на старой кватэры. Але па рашэнню суда жанчыну незаконна пазбавілі права пражываць у гэтай кватэры. Па сутнасці, бабульку выкінулі на вуліцу (жанчыне восьмы дзесятак, яна была вязнем фашысцкіх канцлагераў). Але што да гэтага нашаму правасуддзю, якое пакінула бездаламожную жанчыну сам-насам са сваімі праблемамі.

Куды толькі ні скардзілася жанчына, ніхто не звяртаў увагі. Што датычыцца вышэйшых судовых органаў і пракуратуры, то, згодна з законам, прымаюцца да разгляду іскі, за якія плачана пошліна. Сума яе даволі значная. І вось у роспачы Вольга Уладзіміраўна 11 чэрвеня гэтага года звярнулася з дадатковай скаргай у парадку нагляду ў Пракуратуру Рэспублікі Беларусь. Дарэчы, пры такіх абставінах ніякую дзяржпошліну па закону з яе не трэба было браць. І тым не менш ужо на наступны ж дзень (якая аператыўнасць!) жанчыне была выпісана стандартная адмова: «У адпаведнасці з артыкулам 2 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай пошліне» з наглядных скаргаў (першасных і паўторных) на судовыя пастановы, якія падаюцца ў органы пракуратуры, бярэцца дзяржаўная пошліна.

Ваша скарга пошлінай не аплачана і таму Вам звяртацца».

Вось і ўсё. Куды далей звяртацца па дапамогу беднай жанчыне? Вядома, калі б у яе былі сродкі, магчыма, яна аплаціла б тую пошліну. Але адкуль іх узяць, калі міззрнай пенсіі хапае, як кажуць, на хлеб ды малако.

Сёння многія спасылаюцца на Асноўны закон. Што ж, звернемся да Канстытуцыі, у артыкуле 133 якой запісана, што «нагляд за дакладным і аднастайным выкананнем законаў міністэрствамі і іншымі падведамнымі Кабінету Міністраў органамі, мясцовымі прадстаўнічымі і выканаўчымі органамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі і ўстановамі, грамадскімі аб'яднаннямі, службовымі асобамі і грамадзянамі ўскладаецца на Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь і падначаленых яму пракураў.

Пракуратура ажыццяўляе нагляд за выкананнем законаў пры расследаванні злачынстваў, адпаведнасцю закону судовых рашэнняў па грамадзянскіх, крымінальных справах і справах аб адміністрацыйных правапарушэннях, у выпадках, прадугледжаных законам, праводзіць папярэдняе следства, падтрымлівае дзяржаўнае абвінавачанне ў судах».

У гэтай сувязі варта звярнуць увагу на тое, што пракуратура эвклікана ажыццяўляць нагляд за адпаведнасцю закону судовых рашэнняў па грамадзянскіх і крымінальных справах, справах аб адміністрацыйных правапарушэннях. Гучыць як быццам пераканаўча і прыгожа. Як некалі дэкларавалася на самых высокіх узроўнях: «Усё ў імя чалавека, дзеля яго дабрабыту». А на справе? Прыходзіцца канстатаваць, што пракуратура ажыццяўляе нагляд толькі на платнай аснове, па грамадзянскіх справах — асабліва. Значыць, усе гэтыя дэкларараваныя правы наконт абароны законных інтарэсаў грамадзян на справе — пусты гук. Бо, перш чым звяртацца па дапамогу, трэба заплаціць пошліну. Але ж далёка не на ўсе пратэсты, што ўносіць пракуратура на рашэнні судовых органаў, суды прымаюць да ўвагі і пераглядаюць справы на карысць тых, хто скардзіцца. Нярэдка атрымліваецца, што і правоў сваіх не адстаяў, і грошыкі плакалі, бо дзяржпошліну спярша трэба аплаціць, і толькі пасля гэтага справа прымаецца да разгляду.

Для багатага чалавека адлічыць некалькі соцень тысяч рублёў або нават некалькі мільёнаў — справа звычайная. Ва ўсякім разе, тут кашэль ад падобных адлічэнняў не вельмі патанее. А як жа людзям бедным? Дарэчы, згодна са статыстыкай, такіх нямала. Значыць, па сутнасці яны пазбаўляюцца права на абарону.

Для большай пераканаўчасці перадаплату іскавых заяў у судах і органах нагляду скаргаў у выглядзе дзяржпошліны можна атаясаміць з падачай заявы аб прыняцці чалавека на работу. Людзі, якія падаюць заяву аб прыёме іх на работу, не патрабуюць аплаты наперад. Яе яшчэ трэба зарабіць. Словам, такіх парадоксаў у аспекце працаўладкавання не існуе. А вось у методыцы аплаты дзяржпошліны мы іх прыдумалі і наносім матэрыяльную шкоду юрыдычным і фізічным асобам, дзяржаве, бо значна скарачаем паступленні дзяржпошлін у бюджэт.

Рэальная рэчаіснасць настойліва дыктуе неабходнасць адмены спагнання дзяржпошліны пры падачы скаргаў і іскавых заяў яшчэ і таму, што, атрымаўшы іскавую заяву і вывучыўшы матэрыяльнае становішча бакоў у спрэчцы, суддзі часам выносяць рашэнні не на аснове дзеючага заканадаўства, а насуперак яму. І толькі таму, што ўпэўнены ў адсутнасці фінансавых магчымасцей у адказчыка па справе абскардзіць незаконнае рашэнне. У гэтай сувязі мэтазгодна аднавіць і раней дзеючую практыку выбрання суддзяў на пэўны тэрмін, каб кожны з іх разумеў, што пры вынясенні незаконных рашэнняў ён не будзе выбраны суддзёй на наступны тэрмін. Гэта дазволіць значна змяніць склад мыслення суддзі пры разглядзе кожнай справы і ён будзе кіравацца дзеючым заканадаўствам, а не вядомым афарызмам: «Закон як дышаль, куды павярнуў — туды і выйшаў».

Міхаіл ЛЯШКО, юрыст, дацэнт.

ХТО ІНВЕСЦІРУЕ СВАЮ ДЗЕЙНАСЦЬ, ТОЙ І ВЫЖЫВАЕ

Большая частка насельніцтва, відавочна, мае даволі цмянае ўяўленне аб структуры і нюансах дзейнасці сферы паслуг. Тым больш сёння, калі адначасова з дзяржаўнымі працуюць і недзяржаўныя прадпрыемствы бытавога абслугоўвання, калі адны суб'екты галіны закрываюцца і ствараюцца новыя, калі розніца ў цэнах і якасці паслуг ставіць патэнцыяльнага кліента перад складаным выбарам — дзе зэканоміць, ад якіх паслуг адмовіцца.

У гутарцы з Аляксандрам Паўлавічам Коўшарам, начальнікам упраўлення бытавога абслугоўвання Мінгарвыканкома, мы атрымалі кампетэнтную ацэнку стану галіны, яе праблем і перспектыў у сталіцы..

— У 1991 годзе ў Мінску, — пачаў наш дыялог Аляксандр Паўлавіч, — было 16 комплексаў бытавога абслугоўвання, якія аказвалі каля 700 відаў паслуг жыхарам горада праз сетку сваіх структурных падраздзяленняў (атэлье, салоны, прыёмныя пункты і г. д.). Вынікам працэсаў раздзяржаўлення і дэманапалізацыі, якія ідуць усе апошнія гады, стала з'яўленне прыблізна 600 самастойных прадпрыемстваў, якія аказваюць зноў-такі каля 700 відаў розных паслуг, патрэбных чалавеку ад нараджэння да смерці.

60 працэнтаў усіх суб'ектаў галіны маюць статус прадпрыемстваў з недзяржаўнай формай уласнасці.

— Недзяржаўныя прадпрыемствы знаходзяцца ў сферы ўплыву вашага ўпраўлення?

— Улады сталіцы патрабуюць ад упраўлення кантролю і каардынацыі дзейнасці абсалютна ўсіх структур сферы бытавога абслугоўвання незалежна ад формаў уласнасці. Да паўнацэннага рынку паслуг нам яшчэ далёка і па якасці абслугоўвання, і па ўзроўню арганізацыі ўсёй дзейнасці (уключаючы ўтварэнне цэн). Усё гэта робіць кантроль неабходным.

Новыя прыватныя салоны часта ўяўляюць сабой прадпрыемствы з заходнееўрапейскім узроўнем аказання паслуг, але «дзякуючы» высокім цэнам яны наведваюцца толькі прадстаўнікамі забяспечаных слаёў насельніцтва. У адрозненне ад прыватных, дзяржаўныя прадпрыемствы ўтрымліваюць цэны на адным, большменш прымальным для людзей, узроўні, хоць якасць паслуг тут часта невысокая. Падобныя фактары ставяць кліентаў перад выбарам, і гэта нармальная, здаровая канкурэнцыя.

— Як жа вы на іх уплываеце?

— Галоўная праблема ў тым, што ў нашай галіне няма ліцэнзавання! У ідэале, кожны павінен займацца сваёй справай. Да мяне прыходзіць чалавек, які мае значную суму грошай і хоча адкрыць сваю справу ў сферы бытавога абслугоўвання. Ён паняцця не мае аб спецыфіцы гэтай галіны, але лічыць сябе ўсёмагутным арганізатарам. Я не хачу сказаць, што ўсе такія, але, на жаль, падобныя сітуацыі ўзнікаюць часта.

Я з 1993 года пастаянна вяртаюся ў сваіх выступленнях, эвротах да гэтай праблемы. Б'юся, дарэчы, небеспадстаўна. Напрыклад, у Германіі існуе закон, які вызначае сутнасць і месца суб'ектаў гаспадарання на рынку (на жаль, у нас такога закона няма). Дык вось там, каб заняцца бізнесам, трэба мець сертыфікат прафесіі, прайсці стажыроўку і атрымаць ліцэнзію. Толькі пасля гэтага ты маеш права адкрыць уласную справу. У такой сітуацыі можна гаварыць аб якасці і аб гарантыях.

Нашы праблемы, як і сама галіна, зусім не другарадныя, як прынята лічыць у нашай краіне. На Захадзе ў сферы паслуг занята большая частка насельніцтва, у лічбах гэта выглядае так: на Кіпры — 96 працэнтаў насельніцтва, у Галандыі — 85, у Германіі — 60, у Беларусі — 8—10 працэнтаў.

— Вось гэта і характэрна. Дарэчы, у вашым упраўленні ёсць які-небудзь аддзел, які займаецца вывучэннем попыту, планаваннем развіцця галіны?

— Няма. Плануюць сваю дзейнасць самі прадпрыемствы, мы ж падказваем, падштурхоўваем, патрабуем чагосьці новага і патрэбнага. Ідэі нараджаюцца з убачанага, пачутага, прачытанага, з жыццёвых сітуацый. Але на любыя новаўвядзенні патрэбны грошы, а іх часта і няма.

— Вось якраз аб праблемах, у прыватнасці, фінансавых: дзякуючы чаму выжываюць прадпрыемствы, ці існуюць якія-небудзь датацыі?

— Ніякіх датацый, ніякага дзяржаўнага фінансавання галіны няма, усе пакінуты на саміх сябе. На развіццё сферы бытавога абслугоўвання ідуць або ўласныя, або пазыковыя сродкі, асобныя прадпрыемствы працуюць па лізінгу, прыцягваюць інвестыцыі.

— Галіна рэнтабельная?

— Скажам так: нашы вытворцы, а гэта пашыў адзення, абутку, выраб мэблі на заказ і да т. п., усе стратныя. Але зачыніць іх нельга ні ў якім разе. Тлумачыцца ўсё проста: насычэнне рынку імпартнымі таварамі стварае вельмі моцную канкурэнцыю. Прадпрыемствы, якія аказваюць паслугі (не вырабляюць, а менавіта аказваюць), маюць прыбытак, і нядрэнны.

Гэта дае магчымасць аб'яднанням «Вілія» і «Усход» утрымліваць у разумных межах цэны на свае паслугі. «Чайка», між іншым, прадастаўляе скідкі пэўным катэгорыям насельніцтва па мыццю бялізны.

Для падтрымання прымальнага ўзроўню цэн і якасці неабходна адшукваць дадатковыя сродкі, на што і накіравана камерцыйная дзейнасць прадпрыемстваў сферы паслуг, якая, праўда, не павінна супярэчыць заканадаўству краіны і стасавацца з асноўным профілем. У выніку выжываюць усе прадпрыемствы галіны, але адны працвітаюць, другія — толькі існуюць. Канкурэнтаздольныя тыя, якія накіроўваюць сродкі не ў фонды спажывання, а ў фонды накаплення. Іншых шляхоў набыць сучаснае абсталяванне і забяспечыць дастойны сервіс няма.

Вось вам прыклады. На рэканструкцыю пасля пажару салона «Александрына» пайшло 12 мільярдаў рублёў і яшчэ 2 мільярды неабходна, каб завяршыць стварэнне першакласнага салона. Або навучальны-метадычны цэнтр (Кальварыйская, 5). Гэта ж заходнееўрапейскі ўзровень, там вам падбіраюць прычоску на камп'ютэры.

— 8—10 працэнтаў у нас супраць 60—70 працэнтаў насельніцтва, занятага ў сферы паслуг «у іх» — розніца даволі значная. Калі браць за эталон заходні прынцып занятасці насельніцтва і імкнуцца да яго, то, відаць, трэба пашыраць сетку суб'ектаў. Інакш, якім чынам мяркуецца займаць людзей?

— Вы бывалі ў нашых гасцініцах? Схадзіце і паглядзіце, якое там абслугоўванне. Не шкодзіла б адкрыць пры кожнай гасцініцы свае пральні, хімчысткі і да т. п. Скрытых рэзерваў тут дастаткова.

— Як змянілася папулярнасць бытавых паслуг сярод насельніцтва за апошнія гады?

— Трэба гаварыць аб даступнасці паслуг для большасці насельніцтва. У свой час пральні былі даступнымі і папулярнымі настолькі, што існаваў механізм размеркавання абанементаў у пральні самаабслугоўвання. На сённяшні дзень толькі 4 такія пральні не страцілі сваю кліентуру. Такая ж сітуацыя назіраецца і па іншых відах паслуг.

— Магчыма, існуюць і іншыя фактары, якія ўплываюць на сітуацыю. Напрыклад, многія абзавяліся пральнымі машынамі, або гаспадароў не натхняе перспектыва вазіць дзесяткі кілаграмаў бялізны ад дома да пральні і назад?

— Не, праблема ў дарагоўлі паслуг. За мыццё 10 кілаграмаў бялізны ў пральні самаабслугоўвання трэба заплаціць 57.000—64.000 рублёў. Параўнайце гэтыя лічбы з пенсіямі, з зарплатай педагогаў, медыкаў.

— Якія перспектывы развіцця сферы бытавога абслугоўвання?

— Сур'ёзныя паляпшэнні магчымы ў выпадку прыцягнення інвестыцый, і толькі. У замежных інвестараў цікавасць да нашай галіны ёсць, але актыўнасць вельмі ўмераная, скажам, такткка чакання.

Акрамя таго, сфера бытавога абслугоўвання будзе развівацца па шляху насычэння рынку мініпрадпрыемствамі і расшырэння пераліку аказваемых паслуг, наколькі будуць дазваляць сродкі.

Гутарыла Вольга СТАЎРОЎСКАЯ.

Неабходнае пасляслоўе.

Нягледзячы на фінансавыя праблемы, за апошнія два гады на рынку паслуг з'явіліся новыя: пракат лазерных дыскаў, камп'ютэрных гульняў, гульнявых прыставак і амерыканскай сістэмы па чыстцы дываноў, выраб ключоў для аўтамабіляў імпартнай вытворчасці, экспрэс-фота для дакументаў, распрацаваны і ўкаранёны менш матэрыялаёмістыя мадэлі мэблі, адзення...

У перспектыве плануецца аказанне паслуг па ўборцы памяшканняў пасля рамонту, па аддзелах памяшканняў люстэркамі, па прафілактыцы і эстэтычнай дапамозе пры аблысенні, адкрыццё трох салярыяў з дапамогай заходніх інвестараў.

Вяртаючыся да надрукаванага

Рэкс — сябар паліцэйскага. А многім з нас — вораг

Паводле інфармацыі, распаўсюджанай УУС Магілёўскага аблвыканкома, пачасціліся выпадкі нападу сабак на людзей. У першым паўгоддзі г.г. ад укусаў чатырохногіх «сяброў» пацярпела 616 магіляўчан. Для параўнання: за ўвесь мінулы год такіх ахвяр было 479.

І кусаць мацней сталі. Цяжкія наступствы адзначаліся сёлета ў 264 выпадках. Гэта зноў жа больш таго, што было летась.

Мясцовыя пінкертоны адзначаюць, што напады на людзей ажыццяўляюць у асноўным сабакі байцоўскіх і паліцэйскіх парод, якімі бесперашкодна абзаводзяцца гараджане. Дайшло ўжо да анекдатычнага. Ад гэтых пачвар сталі бараніцца самі міліцыянеры. Супрацоўнік АМОНа — а там, як вядома, служаць найбольш падрыхтаваныя барацьбіты са злачыннасцю, — ратуючыся ад ратвейлера на бульвары Непакароных, вымушаны быў прымяніць зброю.

Ён мог страляць. А што магла процідаставіць магутным клыкам 12-гадовая дзяўчынка, на якую накінуўся сабака на вуліцы Арлоўскага? Або маленькі хлопчык, да шоку напалоханы суседскай аўчаркай у пасёлку Усход? Або падлетак, пакусаны на завулку Гогаля?

Гэта толькі апошнія выпадкі. Не выключана, што пакуль гэтыя радкі дойдуць да друку, спіс пацярпеўшых павялічыцца. Тым больш што дзеці вярнуліся ў горад з месц адпачынку і пайшлі ў школу. А школьныя двары чамусьці ўпадабалі сабакаўладальнікі для выгулу сваіх любімцаў.

Не ў кампетэнцыі міліцыі прымаць дзяржаўныя рашэнні. Яна проста напомніла: у Англіі развядзенне насельніцтвам сабак байцоўскіх парод забаронена. У Германіі ўладальнік такога сабакі павінен мець ліцэнзію, атрыманне якой абстаўлена строгасцямі, як і набыццё зброі. А ў нас дзейнічае даперабудоўчаны ліберальны парадак, устаноўлены краінай, якой няма. Датычыць ён правілаў выгулу сабак і адміністрацыйнай адказнасці за іх парушэнне.

Што ж, тады час быў іншы. Тады грамадзянам не было патрэбы набываць паліцэйскіх рэксаў для аховы сваіх кватэр, бо крадзяжы не насілі такога масавага, як зараз, характару. А сабакі, якіх трымалі больш для экзотыкі, не былі такімі галоднымі. Цяпер жа ўладальнік сабакі часам сам з пустым страўнікам. Не можа дазволіць нават сабе костку.

Між тым, самыя небяспечныя, аказваецца, — сабакі-«харчавікі». У іх настолькі развіты харчовы рэфлекс, што пры выглядзе кавалка мяса яны не шкадуюць нават сваіх гаспадароў. Ад галодных сабак пацярпела сёлета 162 чалавекі. Не варта, думаю, гаварыць, што і гэты паказчык пераўзыходзіць леташні.

Дык ёсць тут пытанне для ўладаў ці не? Безумоўна. «Звязда», дарэчы, сёлета двойчы выступала па гэтай праблеме. Сабачая «злачыннасць», як бачым, не толькі не спынена, а нават расце. Пакуль асобы, заклікаюць вырашаць, лічаць за лепшае адмоўчацца, прэса, у прыватнасці, «Днепровская неделя», вымушана пераводзіць паперу на памяткі, як паводзіць сябе грамадзяніну, калі на яго рыхтуецца напасці сабака. Спыніся. Каб выйграць час, кінь у бок сабакі любы прадмет, але руку высока не падымай. Да сабакі павярніся тварам, можаш кінуцца ёй насустрач — сабак звычайна навучаюць на людзей, якія ўцякаюць. Калі ёсць магчымасць, абматай руку адзеннем, справакуй сабаку на ўкус і моцна ўдар яго па верхняй сківіцы. Калі ж сабака збіла цябе з ног, падай на жывот, рукамі закрый шыю...

Такім вось, спадары, чынам.

Васіль ЛЕЎЧАНКА.

ПЫТАЛЬНІК

Як стаць грамадзянінам ЗША

Паважаная «Звязда»! Не магла б ты падказаць мне, як можна стаць грамадзянінам ЗША і што для гэтага патрэбна?

І. КАНДРАТОВІЧ, г. Магілёў.

1) Пастаяннае пражыванне на тэрыторыі ЗША на працягу 5 гадоў з'яўляецца адной з найважнейшых умоў. Пацвярджэннем гэтаму служыць «грын карт», якую выдаюць новапрыбыўшаму, калі ён мае пастаяннае месца работы. Тым, хто не мае работы, застаецца спадзявацца на ўдачу.

На працягу некалькіх гадоў, каб урэгуляваць становішча з незаконнымі імігрантамі і прыцягнуць еўрапейцаў, урад ЗША праводзіць штогадовую латарэю, у якой могуць удзельнічаць не толькі легалы, але і тыя, хто жыве ў сваіх родных краінах. Таксама яна дае магчымасць уезду ў ЗША і для ўсёй сям'і, што прадугледжана амерыканскім заканадаўствам. У кожным тыражы латарэі абмежаваная колькасць кандыдатаў (у 1996 г. — 55.000) заносіцца ў камп'ютэр, які і вызначае шчасліўцаў.

2) Калі хочаце стаць амерыканцам — майце сваякоў амерыканцаў. Дастаткова, каб адзін з бацькоў быў грамадзянінам ЗША, або вашы бабуля ці дзядуля.

Але і тут ёсць нюансы. Неабходна засведчыць, што бацька — амерыканец пасля 14-годдзя на працягу 5 гадоў жыў на тэрыторыі ЗША. Калі ж дзіця нарадзілася да 1986 г. (дата змянення закона), то адзін з бацькоў павінен пацвердзіць, што жыў 10 гадоў на тэрыторыі ЗША, з якіх 5 — пасля 14-годдзя.

3) Адзін з самых простых, але, на жаль, незалежачых ад вас спосабаў стаць грамадзянінам ЗША — нарадзіцца на амерыканскай зямлі, нават калі бацькі-іншаземцы. Сюды ж адносяцца тыя выпадкі, калі гэта адбылося на борце самалёта, які да моманту вашага нараджэння перасек паветраную прастору ЗША.

4) Што калі паслужыць у амерыканскай арміі? У 1994 г. Б. Клінтан даў амерыканскае грамадзянства ўсім жадаючым, хто прымаў удзел у ваенных дзеяннях у час вайны ў заліве. Такім жа чынам «аддзячылі» тых, хто ваяваў у В'етнаме.

5) Трэба расчараваць тых, хто думае што шлюб з грамадзянінам (грамадзянкай) ЗША дае вам грамадзянства аўтаматычна, ён толькі прыкметна скарачае тэрмін падачы прашэння да 3-х гадоў замест 5-ці.

6) Стаць грамадзянінам ЗША вы таксама можаце, калі будзеце адзначаны прэзідэнтам гэтай краіны, як гэта здарылася, напрыклад, з У. Чэрчылем, якому Дж. Кенедзі прысвоіў званне ганаровага грамадзяніна ЗША.

Калі вы вырашылі змяніць грамадзянства, то не перашкодзіць схадзіць у бібліятэку і папоўніць запас ведаў, таму што пасля ўсіх перыпетый вы павінны прайсці тэст, які складаецца прыкладна са 100 пытанняў аб гісторыі і асновах устройства ЗША. І ўсё гэта, вядома, на англійскай мове. Цырымонія пасвячэння новых грамадзян адбываецца вельмі ўрачыста ў адным з публічных месцаў, дзе каля сотні новаспечаных амерыканцаў клянуцца ў адданасці свайму новаму народу.

А ўсё ж раім — лепш за ўсё жыць на Радзіме.

Таццяна КАЗАК.

НА РАБОТУ ЯК НА ФРОНТ

ПРЫЧЫНАМІ ДА 80 ПРАЦЭНТАЎ НЯШЧАСНЫХ ВЫПАДКАЎ НА ВЫТВОРЧАСЦІ СТАНОВЯЦЦА ЎМОВЫ ПРАЦЫ АЛЬБО ЯЕ АРГАНІЗАЦЫЯ

Параўноўваючы раз-пораз работу з перадавой, мы неяк не задумваемся, што за гэтай аналогіяй могуць стаяць канкрэтныя лічбы, што статыстыка пацярпеўшых на вытворчасці сапраўды нагадвае жорсткія франтавыя зводкі.

Зрэшты, аб гэтым гутарка карэспандэнта «Звязды» з начальнікам упраўлення аналітычнага і метадычнага забеспячэння Дзяржаўнай інспекцыі працы Рэспублікі Беларусь Леанідам Аляксандравічам ГАРКОВІЧАМ.

— Пытанне не зусім звыклае, але тым не менш: хадзіць у нашай краіне на працу — гэта бяспечна?

— Стан спраў з вытворчым траўматызмам, з прафесіянальнымі захворваннямі, арганізацыяй работы па ахове працы на Беларусі па-ранейшаму застаецца крытычным. На сёння ў прамысловасці р

Панядзелак, 16 верасня

Беларускае тэлебачанне

15.00 Навіны.
15.10 «Фліпер». Тэлесерыял для дзяцей.
15.35 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 5-ы клас. «У свеце казкі».
16.00 Студыя «Акно». «Тэлекшоу». Гумарыстычная праграма; жылі-былі... Перадача 3-я.
16.35 У палоне часу. «Атамныя салдаты». Тэленарыс.
17.05 На добры лад. Перадача з Віцебска.
17.20 «Кіраўскія майстры». Дак. фільм.
17.30 Творчае маладзёжнае аб'яднанне «Крок». «Рызыка-версія». Госць праграмы — група «Фрыстайл» (г. Кіеў).
17.50 Музычны антракт.
18.00 Фінансавы час.
18.25 Эканамікст.
18.35 «Тройчы па аднаму». Музычная перадача MTV.
18.50 Навіны (з сурдаперакладам).
19.00 Рэферэндум: шчырая размова.
19.50 Беларускі дом. Да 50-годдзя паэта Сяргея Законнікава.
20.25 Актуальнае інтэрв'ю. Прымае ўдзел начальнік упраўлення Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь С. М. Дзямяшкевіч.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 Спартыўны тэлекур'ер.
22.05 Фільматэка. Мікалай Рыбнікаў і Зоя Фёдарава ў маст. фільме «Дзяўчына без адрасу».
23.30 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Лакаматыў-96» (Віцебск) — МВКЦ (Мазыр). 2-гі тайм. Перадача з Віцебска.
0.20 Навіны.

ГРТ

14.00 Навіны.
14.20 Прэм'ера «Горад сабак». Мультсерыял.
14.45 Марафон-15.
15.00 Зорная гадзіна.
15.40 «Элен і хлопцы».
16.05 Джэм.
16.30 «Вакол свету».
17.00 Навіны.
17.20 «Новая ахвяра». Серыял.
18.10 Гадзіна пік.
18.35 «Адгадай мелодыю».
19.00 Прэс-клуб.
19.45 «Добрай ночы, малышы!»
20.00 Час.
20.35 Праграма перадач.
20.40 Фантастычны дэтэктыў «Багз — электронныя жучкі». «Забойства на вяселлі».
21.45 «Да і пасля...»
22.30 Кубак свету «Майстар-ралі-96». Парыж—Масква—Байканур—Улан-Батар.
22.45 Навіны.
22.55 Фільм Аляксандра Сакурава «Журботнае бяздушша».

Расія

16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
16.20 Блак-нот. Музычна-інфармацыйная праграма.
16.35 «Чэленджэрс». Серыял для падлеткаў.
17.05 Залежыць ад цябе.
17.20 Тэлечасопіс «Ахова працы».
17.30 L-клуб.
18.15 Момант ісціны.
19.30 «Санта-Барбара».
20.30 Дзённік Кубка свету па хакею.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 «На вастрыё нажа». Шматсерыйны маст. фільм (Вялікабрытанія).
22.00 Тэлескоп.
22.30 Халаднаваты свет.
23.20 Тавары — поштай.
23.30 Музыка ўсіх пакаленняў.
23.40 «Не спі і глядзі». Начная музычна-забаўляльная праграма.

Санкт-Пецярбург

13.00 Тэрмін адказу — сёння.
13.30 Парады садаводам.
13.40, 20.35 Тэлеслужба бяспекі.
13.55, 16.00, 18.55, 22.10, 23.05 Інфарм ТБ.
14.10 «Першае каханне». Серыял.
14.55 «Жыццё Кліма Самгіна». Серыял. 9-я серыя.
16.10 Міжнародны агляд.
16.35 «Філасофія па Філу». Серыял для падлеткаў.
17.00 Стыль жыцця.
17.05 «Солці». Серыял. 7-я серыя.
17.35 Паказвае Ленінградская абласная тэлекампанія.
18.40 Вялікі фестываль.
19.15 Спорт.
19.20 «Першае каханне». Серыял.
20.10 Міжнародны тэатральны фестываль імя А. П. Чэхава. Перадача 1-я.
20.55 Спартыўны агляд.
21.05 «Жыццё Кліма Самгіна». Серыял. 10-я серыя.
22.20 Гістарычныя расследаванні. Пацыент Брэжнеў.

НТБ

6.00 Анонс тыдня.
6.10 Серыял для жаваранкаў. «Мафія-1».
6.50 Маст. фільм «Замкнутае кола» (ЗША).
8.25 «Чалавек у масцы».
9.00, 13.00 Сёння.
9.20 Дак. фільм «Успомніце тыя гады. 1971» (Вялікабрытанія).
10.15 Лепшыя цыркі свету.
11.15 Маст. фільм «Логава белага чараяка» (Вялікабрытанія).
12.50 Рускі альбом.
13.20 «Доктар «Вугал».
13.30 Вынікі.

Расійскія універсітэты

14.55 Астралогія кахання.
15.30 Урокі Феміды. Тэлеконкурс.
16.00 Музычныя навіны.
16.10 «Брадвей» нашага юнацтва». Дак. фільм А. Габрыловіча.
16.40 Навіны.

НТБ

17.00 Дак. фільм «Дзікая прырода. Барацьба за жыццё».
17.30 Футбольны клуб.
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.35 Герой дня.
19.00 Маст. фільм Дзіна Рызі «Прашу не хвалявацца».
20.40 Рускі альбом.
21.35 Фестываль міні-серыялаў. «Анасіс» (ЗША). 3-я серыя.
22.30 Часінка.
23.20 Сусветная шахматная алімпіяда.
23.25 Тэніс у поўнач.

Аўторак, 17 верасня

Беларускае тэлебачанне

8.00 Навіны.
8.15 Абібок.
8.45 Актуальнае інтэрв'ю.
9.00 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 5-ы клас. «У свеце казкі».
9.25 «Дзяжурная аптэка». Тэлесерыял.
10.25 Тураб'ектыў. Падарожжы, сустрэчы, адпачынак.
15.00 Навіны.
15.15 «Фліпер». Тэлесерыял для дзяцей.
15.40 «Як Алдар Касэ перахітрыў тыгра», «Алдар Касэ і бай», «Алдар Касэ, мядзведзь і заяц». Мультфільмы.
16.05 Тэлебачанне — школе. Чалавек і свет. 1-ы клас. «Дзівосны свет жывой прыроды».
16.25 Усё пра ўсё. Інфармацыйна-пазнавальная праграма для дзяцей.
16.50 Чарнобыль: праблемы і вырашэнні. Двухбаковы рух дабрачыннасці.
17.20 Урокі Наталлі Наважылавай.
17.50 Музычны антракт.
18.00 «Пра чорнага собаля». Дак. фільм.
18.15 «Будзьце здаровы».
18.25 Эканамікст.
18.35 «Тройчы па аднаму». Музычная перадача MTV.
18.50 Навіны (з сурдаперакладам).
19.00 Рэферэндум: шчырая размова.
19.35 «Дзяжурная аптэка». Тэлесерыял.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Хроніка жніва-96.
22.15 «Зоркі на экране. Алег Барысаў і Лідзія Федасеева-Шукшына ў маст. фільме «Па галоўнай вуліцы з аркестрам».
23.45 Бенефіс Алены Казанцавай.
0.25 Навіны.

ГРТ

11.00 Навіны (з сурдаперакладам).
11.10 У эфіры тэлерадыёкампанія «Мір». «Мы і рынак».
11.55 «Рэкет». 1-я серыя.
12.55 «Мікалай Рыбнікаў. Каб памяталі...» Аўтарская праграма Л. Філатава.
13.35 «Дракон». Мультфільм.
14.00 Навіны (з сурдаперакладам).
14.20 «Горад сабак». Мультсерыял.
14.45 Квар'ёта «Вясёлая кампанія».
14.55 Мульцітролія.
15.10 Чароўны свет, ці Сінема.
15.40 «Элен і хлопцы».
16.05 ...Да шаснаццаці і старэйшым.
16.30 «Вакол свету». Па старонках перадачы «Клуб падарожнікаў».
17.00 Навіны.
17.20 «Новая ахвяра».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 «Адгадай мелодыю».
19.00 Тэма.
19.45 «Добрай ночы, малышы!»
20.00 Час.
20.35 Праграма перадач.
20.40 Мікалай Рыбнікаў у фільме «Вышыня».
22.25 Кубак свету «Майстар-ралі-96». Парыж—Масква—Байканур—Улан-Батар.
22.40 Навіны.
22.50 «Каханне, падобнае на сон». Спявае Ала Пугачова.

Расія

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.45 Рэтра-шлягер.
8.10 Дарагая рэдакцыя...
8.40 «Залатое кураня». Маст. фільм.
9.50. Мультфільм.
16.20 Блак-нот. Музычна-інфармацыйная праграма.
16.30 «Чэленджэрс». Серыял для падлеткаў.
17.00 Залежыць ад цябе.
17.15 Тэлечасопіс «Здароўе».
17.25 Цецярбургскія сезоны.
17.55 Надзвычайны канал.
18.25 Лідэр-прагноз.
19.30 «Санта-Барбара».
20.30 Джэнтльмен-шоу.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 Мужчына і жанчына.
21.45 Цяжкі дом. «Венецыя-96».
22.25 Эх, дарогі!
23.20 Тавары—поштай.
23.30 Музыка ўсіх пакаленняў.
23.40 «Хто на што здатны». Конкурсная праграма.
23.55 Гарачая дзесятка.

Санкт-Пецярбург

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 22.10, 23.35 Інфарм ТБ.
12.10 «Першае каханне». Серыял.
13.00 Тэрмін адказу — сёння.
13.30 Парады садаводам.
13.40, 20.40 Тэлеслужба бяспекі.
14.10 «Жыццё Кліма Самгіна». Серыял. 10-я серыя.
15.15 Спявае Сяргей Захараў.
16.10 Тата, мама і я — спартыўная сям'я.
16.35 «Філасофія па Філу». Серыял для падлеткаў.
17.00 Стыль жыцця.
17.05 Дзіцячае ТБ. «Там, дзе жыве Павуцінык». «Студыя «Уяві».
17.35 Паказвае Ленінградская абласная тэлекампанія.
18.40 Вялікі фестываль.
19.15 Спорт.
19.20 «Першае каханне». Серыял.
20.10 Формула згоды.
20.55 Спартыўны агляд.
21.05 «Жыццё Кліма Самгіна». Серыял. 10-я серыя.
22.25 «Каментарый да прашэння аб памілаванні». Маст. фільм (Расія). 1-я серыя.

НТБ

6.00, 9.00, 13.00 Сёння.
6.20 «Мафія-1». Серыял. Заключная серыя.
7.10 Маст. фільм «Мужчыны».
8.45 Рускі альбом. Група «Сінцовы туман».
9.20 Маст. фільм «Цудоўныя гады» (ЗША).
9.45 Дак. фільм «Успомнім тыя гады. 1972».
10.35 Маст. фільм «Прашу не хвалявацца».
12.10 Фестываль міні-серыялаў. «Анасіс» (ЗША). 3-я серыя.

Расійскія універсітэты

14.40 «Сапраўднае і бачнае». Дак. фільм.
15.00 Маленькі канцэрт П. І. Чайкоўскага. Духоўная музыка.
15.15 Ю. М. Лотман. Гутаркі аб рускай культуры. Перадача 3-я.
16.00 Музычныя навіны.
16.10 «Брадвей» нашага юнацтва». Дак. фільм А. Габрыловіча.
16.40 Навіны.

НТБ

17.00 Дак. фільм «Дзікая прырода: барацьба за выжыванне».
17.30 Жаночыя гісторыі. «Міс Роз Уайт» (ЗША).
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.35 Герой дня.
19.00 Жан Рашфор, Даніэль Дар'е і Ані Жырардо ў фільме Філіпа да Брока «Гуляка» (Францыя).
20.45 «Доктар Вугал».
21.35 Фестываль міні-серыялаў. «Анасіс». Заключная серыя.
22.30 Часінка.
23.20 Сусветная шахматная Алімпіяда.
23.25 Вялікі рынг.
23.55 Меламанія. «Рэй Чарльз».

Серада, 18 верасня

Беларускае тэлебачанне

8.00 Навіны.
8.15 «Я песні аддаў усё спаўна». Музычны фільм, прысвечаны творчасці І. В. Дунаеўскага.
9.00 Тэлебачанне — школе. Чалавек і свет. 1-ы клас. «Дзівосны свет жывой прыроды».
9.20 «Дзяжурная аптэка». Тэлесерыял.
10.20 Відэзма-навідзьма.
15.00 Навіны.
15.15 «Фліпер». Тэлесерыял для дзяцей.
15.40 «Добры дзень, цётка Ліса», «На рынгу», «Казка пра старое Рэха», «Паходня і балерына». Мультфільмы.
16.15 Канцэртны сезон. Сімфанічны аркестр Беларускай оперы.
17.15 Крада. Праблемы лясной гаспадаркі Беларусі.
17.35 Музычны антракт.
17.45 Творцы. «Асветнік Віктар Жак». Тэленарыс.
18.25 Эканамікст.
18.35 «Тройчы па аднаму». Музычная перадача MTV.
18.50 Навіны (з сурдаперакладам).
19.00 Рэферэндум: шчырая размова.
19.35 «Дзяжурная аптэка». Тэлесерыял.
20.35 «Хто гэта?» Тэлегульня.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Аўта-парк.
22.15 Ірына Мураўёва ў тэлевізійным маст. фільме «Артыстка з Грыбава». 1-я серыя.
23.25 Супергол.
24.00 Навіны.
0.15 Каралеўскае паляванне.

ГРТ

11.00 Навіны
11.10 У эфіры тэлерадыёкампанія «Мір». «Кантакт — дзелавое супрацоўніцтва краін Садружнасці». «Медыцынскі агляд».
11.55 «Рэкет». 2-я серыя.
13.00 «Вадзім Спірыдонаў. Каб памяталі...» Аўтарская праграма Л. Філатава.
13.40 «На дачы». Мультфільм.
14.00 Навіны (з сурдаперакладам).
14.20 «Горад сабак».
14.45 Кактус і К.
14.55 До-мі-соль.
15.10 Покліч джунгляў.
15.40 «Элен і хлопцы».
16.05 «Тэт-а-тэт».
16.30 «Вакол свету». Па старонках перадачы «Клуб падарожнікаў».
17.00 Навіны.
17.20 «Новая ахвяра».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 «Адгадай мелодыю».
19.00 «Парыжскія тайны Эльдара Разанава». Клаўдзія Кардынале.
19.45 «Добрай ночы, малышы!»
20.00 Час.
20.35 Праграма перадач.
20.40 Клаўдзіа Кардынале ў фільме «Чырвоная палатка».
23.25 Кубак свету «Майстар-ралі-96».
23.40 Навіны.

Расія

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 У свеце капіталу.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.30 Дарагая рэдакцыя...
8.55 «Санта-Барбара».
9.50 Тавары — поштай.
10.20-11.15 «Санта-Барбара».
16.20 Блак-нот. Музычна-інфармацыйная праграма.
16.30 «Чэленджэрс». Серыял для падлеткаў.
17.00 Залежыць ад цябе.
17.15 Тэлечасопіс «Здароўе».
17.25 Даміно Міхаіла Баярскага.
17.55 Суайчыннікі.
18.25 Губернскія выбары-96.
19.30 «Санта-Барбара».
20.30 Гарадок. Музычна-забаўляльная праграма.
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 Е. Германава і Э.Раманаў у фільме «Ніягара».
22.45 Рэк-тайм.
23.20 Тавары — поштай.
23.30 Музыка ўсіх пакаленняў.
23.40 «Хто на што здатны». Конкурсная праграма.
23.55 «Не спі і глядзі». Начная музычна-забаўляльная праграма.

Санкт-Пецярбург

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 22.20, 23.35 Інфарм ТБ.
12.10 «Першае каханне». Серыял.
13.00 Тэрмін адказу — сёння.
13.30 Парады садаводам.
13.40, 20.40 Тэлеслужба бяспекі.
14.10 «Жыццё Кліма Самгіна». Серыял. 11-я серыя.
15.25 Тэлекампакт.
16.10 Асабістая справа.
16.35 «Філасофія па Філу». Серыял для падлеткаў.
17.00 Стыль жыцця.
17.05 «Солці». Серыял. 8-я серыя.
17.35 Паказвае Ленінградская абласная тэлекампанія.
18.40 Вялікі фестываль.
19.15 Спорт.
19.20 «Першае каханне». Серыял.
20.10 Аркестр «Класіка» ў Амерыцы.
20.55 Спартыўны агляд.
21.05 «Жыццё Кліма Самгіна». Серыял. 11-я серыя.
22.35 «Каментарый да прашэння аб памілаванні». Маст. фільм. 2-я серыя.

НТБ

6.00, 9.00, 13.00 Сёння.
6.20 «Мафія-2». Серыял (Італія). 1-я серыя.
7.10 Маст. фільм «Пінг-Понг» (Вялікабрытанія).
8.45 Рускі альбом.
9.20 Маст. фільм «Цудоўныя гады».
9.40 Дак. фільм «Успомніце тыя гады. 1973».
10.30 Маст. фільм «Гуляка».
12.10 Фестываль міні-серыялаў. «Анасіс». Заключная серыя.

Расійскія універсітэты

14.00 Нямецкая мова.
14.30 Спяваю для вас. Ірына Салтыкова.
14.40 Жыццё дзеля ўзнагароды.
15.10 «Маскоўскі крэмль. Дзеяць стагоддзяў». Дак. фільм. «Сэрца Расіі».
16.00 Музычныя навіны.
16.10 «Брадвей» нашага юнацтва». Дак. фільм А. Габрыловіча.
16.40 Навіны.

НТБ

17.00 Дак. фільм «Дзікая прырода: барацьба за жыццё».
17.30 Жаночыя гісторыі. «Яе першы мужчына».
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.35 Герой дня.
19.00 Одры Хепбер у фільме «І злодзеі кахаюць» (ЗША).
20.35 Рускі альбом.
21.35 Фестываль міні-серыялаў. «Здзелка Райнмана». (ЗША).
22.30 Часінка.
23.20 Сусветная шахматная Алімпіяда.
23.25 Такое спартыўнае жыццё.
23.55 Кафэ «Абломаў».

Чацвер, 19 верасня

Беларускае тэлебачанне

8.00 Навіны.
8.15 Аўта-парк.
8.30 «Падзеі культурнага жыцця». Дак. фільм.
8.55 «Дзяжурная аптэка». Тэлесерыял.
9.55 Каралеўскае паляванне.
15.00 Навіны.
15.15 «Фліпер». Тэлесерыял для дзяцей.
15.45 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 10-ы клас. «Маё сэрца поўнае любасці» (У. Жылка і яго творчасць).
16.05 Рок-урок.
